УДК 94(476)«639»:930.1(476)+930.1(476):94(092)ШЧАРБАКОЎ

# «ПЕРВОБЫТНО-КОММУНИСТИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО И ЕГО РАСПАД»: ДОИСТОРИЧЕСКОЕ ПРОШЛОЕ ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ СОГЛАСНО КОНЦЕПЦИИ В. К. ЩЕРБАКОВА

***А. В. ВАЙТОВИЧ***[1]**,** ***П. С. КУРЛОВИЧ***[1]

[1]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Анализируется концепция первобытно-коммунистического общества, которая была изложена известным ученым и организатором науки 1930-х гг., первым деканом исторического факультета Белорусского государственного университета В. К. Щербаковым в работе «Очерк истории Беларуси» (1934). Эта книга стала первой в отечественной исто-

**Образец цитирования:**
Вайтовіч АУ, Курловіч ПС. «Першабытна-камуністычнае грамадства і яго распад»: дагістарычнае мінулае тэрыторыі Беларусі паводле В. К. Шчарбакова. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2020;3:54–63.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-3-54-63.

**For citation:**
Vaitovich AU, Kurlovich PS. «The primitive communist society and its decomposition»: the prehistorical past of the territory of Belarus by V. K. Shcharbakou. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;3:54–63. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-3-54-63.

**Авторы:**
***Александра Владимировна Вайтович*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.
***Полина Сергеевна Курлович*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

**Authors:**
***Aliaksandra U. Vaitovich***, PhD (history); associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-8082-4215*
***Palina S. Kurlovich***, PhD (history); associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*kurlovichp@bsu.by*
*https://orcid.org/0000-0002-8987-0162*

риографии попыткой систематически осветить начальный период истории нашей страны в марксистском ключе. Исследователь не ставил перед собой цель подготовить полноценную археологическую публикацию. Создавая синтетический обзор истории Беларуси, В. К. Щербаков включил в него лишь отдельные темы, связанные с первобытной и раннесредневековой археологией. Методологические подходы ученого к изучению древней истории находились в русле теоретических разработок советской исторической науки 1920-х – начала 1930-х гг. и на момент выпуска работы уже не соответствовали новым идеологическим установкам. Осуществленное авторами статьи определение вклада В. К. Щербакова в интерпретацию первобытной истории Беларуси позволяет лучше понять историю белорусской археологической и исторической мысли межвоенного периода.

***Ключевые слова:*** Василий Карпович Щербаков; первобытный коммунизм; 1930-е гг.; Белорусский государственный университет; историческая школа Покровского; археология Беларуси.

# «ПЕРШАБЫТНА-КАМУНІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА І ЯГО РАСПАД»: ДАГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАВОДЛЕ В. К. ШЧАРБАКОВА

***А. У. ВАЙТОВІЧ***[1*]***, П. С. КУРЛОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Аналізуецца канцэпцыя першабытна-камуністычнага грамадства, выкладзеная вядомым навукоўцам, арганізатарам навукі 1930-х гг., першым дэканам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта В. К. Шчарбаковым у працы «Нарыс гісторыі Беларусі» (1934). Гэта кніга стала першай у айчыннай гістарыяграфіі спробай сістэматычнага асвятлення пачатковага перыяду гісторыі нашай краіны ў марксісцкім ключы. Даследчык не ставіў перад сабой мэты падрыхтаваць паўнавартасную археалагічную публікацыю. Ствараючы сінтэтычны агляд гісторыі Беларусі, ён уключыў у яго толькі асобныя тэмы, датычныя першабытнай і раннесярэдневяковай археалогіі. Метадалагічныя падыходы навукоўца да вывучэння старажытнасці знаходзіліся ў рэчышчы тэарэтычных распрацовак савецкай гістарычнай навукі 1920-х – пачатку 1930-х гг. і на момант выхаду працы ўжо не адпавядалі новым ідэалагічным устаноўкам. Здзейсненае аўтарамі артыкула вызначэнне ўнёску В. К. Шчарбакова ў справу інтэрпрэтацыі першабытнай гісторыі Беларусі дазваляе лепш зразумець гісторыю беларускай археалагічнай і гістарычнай думкі міжваеннага часу.

***Ключавыя словы:*** Васіль Карпавіч Шчарбакоў; першабытны камунізм; 1930-я гг.; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; гістарычная школа Пакроўскага; археалогія Беларусі.

# «THE PRIMITIVE COMMUNIST SOCIETY AND ITS DECOMPOSITION»: THE PREHISTORICAL PAST OF THE TERRITORY OF BELARUS BY V. K. SHCHARBAKOU

***A. U. VAITOVICH***[a]***, P. S. KURLOVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

*Corresponding author: A. U. Vaitovich (vaitovich.aliaksandra@gmail.com)*

The article is devoted to the analysis of the concept of the «primitive communist society» set out by the famous scientist and organizer of science in the 1930s, the first dean of the historical faculty of Belarusian State University V. K. Shcharbakou in his «Essay on the history of Belarus» (1934). This book was the first attempt in native historiography to systematically illuminate the initial period of the history of our country in a marxist manner. The researcher did not set himself the goal of preparing a full-fledged archaeological publication. Creating a synthetic review of the history of Belarus, he included in it only certain topics related to primitive and early medieval archaeology. The scientist's methodological approaches to the study of ancient history corresponded to the theoretical developments of Soviet historical science in the 1920s – at the beginning of the 1930s, and the work no longer match the new «settings» by the time of release. The authors of the article determined the contribution of V. K. Shcharbakou to the interpretation of the primitive history of Belarus, which allows to understand better the history of Belarusian archaeological and historical thought of the interwar period.

***Keywords:*** Vasily Karpavich Shcharbakou; primitive communism; 1930s; Belarusian State University; Pokrovsky historical school; archaeology of Belarus.

## Уводзіны

Асоба Васіля Карпавіча Шчарбакова (1898–1938) – акадэміка, дырэктара Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук, першага дэкана гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – звычайна застаецца па-за ўвагай даследчыкаў, якія вывучаюць гісторыю беларускай археалагічнай думкі. Між тым у 1934 г. вядомы беларускі археолаг А. М. Ляўданскі рэкамендаваў яго толькі што апублікаваную кнігу па гісторыі Беларусі ў якасці асноўнага дапаможніка па курсе «Гісторыя дакласавага грамадства», які чытаў для першакурснікаў гістарычнага факультэта БДУ [1, с. 18–19]. У гістарыяграфіі 1980-х і пазнейшых гадоў за В. К. Шчарбаковым замацавалася рэнамэ аўтара прац па гісторыі першабытна-абшчыннага ладу на тэрыторыі Беларусі[1] [2, с. 114–115]. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў асобныя палажэнні канцэпцыі даследчыка, датычныя дагістарычнага мінулага нашай краіны, неаднаразова станавіліся аб'ектам асэнсавання гісторыкаў [3, с. 247–248, 251; 4, с. 6]. Разам з тым дэталёвы разгляд унёску В. К. Шчарбакова ў справу інтэрпрэтацыі першабытнай даўніны дагэтуль не здзейснены. Не быў прааналізаваны і археалагічны складнік канцэпцыі першабытна-камуністычнага грамадства. З улікам гэтых акалічнасцей уяўляецца мэтазгодным паўторны зварот да творчай спадчыны аднаго з самых тытулаваных беларускіх гісторыкаў і арганізатараў навукі першай паловы 1930-х гг.

Жыццёваму шляху і навуковай дзейнасці В. К. Шчарбакова прысвечана даволі прадстаўнічая бібліяграфія[2] [2, с. 114–115; 5, с. 26–27; 4; 6]. Ураджэнец Аршаншчыны, ён ужо ў юнацкія гады захапіўся палітычнай дзейнасцю. Пасля заканчэння Грамадзянскай вайны нядаўні выпускнік Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі адвучыўся ў Вышэйшай партыйнай школе ў Харкаве і пачаў узыход па прыступках партыйнай лесвіцы. Неўзабаве Васіль Карпавіч зацікавіўся і навуковай працай, заняўшыся вывучэннем гісторыі кастрычніцкіх падзей на тэрыторыі Украіны. У канцы 1920-х гг. ён узначаліў Чарнігаўскі інстытут народнай адукацыі, а ў 1930 г. быў запрошаны ў Мінск, дзе адразу атрымаў шэраг высокіх партыйных і акадэмічных пасад. Нованабраны акадэмік Беларускай акадэміі навук заняўся падрыхтоўкай публікацый па гісторыі сялянскага руху эпохі феадалізму, гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўстве. У 1934 г. В. К. Шчарбакову, ужо прызначанаму дэканам гістарычнага факультэта БДУ, спецыяльным рашэннем СНК і ЦК КП(б)Б было даручана напісаць усеагульны курс беларускай гісторыі ў святле сталінскіх установак. У тым жа годзе першая частка запланаванага двухтомніка пад назвай «Нарыс гісторыі Беларусі» выйшла з друку. Гэта была вяршыня партыйнай і навуковай кар'еры гісторыка. У 1935 г. кніга падвергліся разгромнай крытыцы, а ў 1937 г. яе аўтар трапіў у жорны рэпрэсій.

Напісанне В. К. Шчарбаковым абагульняючай працы па беларускай гісторыі супала з завяршэннем дыскусій савецкіх навукоўцаў аб сацыяльна-эканамічных фармацыях і ўкараненнем сфармуляванай тэарэтыкамі Дзяржаўнай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры «пяцічленкі» [7, с. 139–142; 8, с. 162–163; 9, с. 79–80]. У адпаведнасці з найноўшай марксісцкай схемай развіцця грамадства даследчык падзяліў гісторыю Беларусі на чатыры перыяды («сацыяльныя арганізмы»): першабытны камунізм, феадалізм, капіталізм, перыяд дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнага будаўніцтва (асобна агаворвалася адсутнасць рабаўладальніцкага этапу) [10, с. 19–23]. В. К. Шчарбакоў першым з айчынных гісторыкаў выкарыстаў вучэнне аб сацыяльна-эканамічных фармацыях для асвятлення беларускай мінуўшчыны, у тым ліку яе самай старажытнай эпохі. Гэты факт неаднаразова падкрэсліваўся як сучаснікамі Васіля Карпавіча [11, с. 182], так і сённяшнімі даследчыкамі (гл., напрыклад, [3, с. 247–248; 2, с. 114–115; 4, с. 8]). Аднак у навуковай літаратуры да гэтага часу не ўздымалася пытанне аб адметнасцях першай практычнай рэалізацыі фармацыйнага падыходу да разгляду дапісьмовага і дадзяржаўнага перыяду гісторыі Беларусі. Асэнсаванню гэтай малавядомай старонкі айчыннай гістарыяграфіі і прысвечаны дадзены артыкул.

## Асноўная частка

Тэрмін «першабытны камунізм» з'явіўся ў чарнавых запісах К. Маркса ў 1858 г. [12, с. 10]. Незалежна ад нямецкага філосафа і грамадскага дзеяча ў 1877 г. Л. Г. Морган ахарактарызаваў адмысловыя адносіны ў першабытным грамадстве як камуністычныя. Ідэі Л. Г. Моргана атрымалі развіццё ў кнізе Ф. Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» (1884). На працягу 1898–1919 гг. згаданы тэрмін неаднаразова выкарыстоўваўся У. І. Леніным [12, с. 9; 13, с. 144–145; 14, с. 36]. Праблемы першабытнасці набылі надзвычайную ідэалагічную актуальнасць у 1920-х гг., калі, у святле марксісцкай тэорыі, пер-

[1] *Дулеба Г. І.* Вёска Дубраўка, Дубраўскі сельсавет. Радзіма Шчарбакова В. К. // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць : энцыклапедыя / С. В. Марцэлеў (гал. рэд.). Мінск, 1985. С. 106 ; Возвращенные имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий / под ред. А. С. Махнача. Минск : Наука и техника, 1992. С. 118–119.

[2] Там же ; Институт истории Национальной академии наук Беларуси в лицах (1929–2008 гг.) : биобиблиогр. справ. / под ред. Г. В. Корзенко [и др.]. Минск : Белорус. наука, 2008. С. 48–53 ; Национальная академия наук Беларуси: персональный состав. 1928–2015 / сост. Т. С. Буденкова [и др.]. Минск : Беларус. навука, 2015. С. 278.

шабытны камунізм пачалі ўспрымаць як гістарычны доказ магчымасці існавання бяскласавага грамадства ў будучым. Перад навукоўцамі паўстала неабходнасць вызначэння канкрэтнага зместу «першабытна-камуністычнага перыяду». Задача ўскладнялася тым, што ў працах заснавальнікаў марксізму адсутнічалі разважанні аб асаблівасцях і храналагічных межах ранніх этапаў гісторыі чалавецтва [12, с. 25; 15, с. 89]. На працягу 1920-х гг. абмеркаванні гэтых пытанняў вяліся пераважна ў асяродку этнолагаў, на рубяжы 1920–30-х гг. да дыскусіі далучыліся і археолагі. У заўзятых спрэчках вырашалася, ці існаваў у архаічных супольнасцях першабытна-камуністычны лад. Было зламана нямала коп'яў пры вызначэнні ступені дапасавання паняцця «фармацыя» да першабытнасці. Агучваліся розныя меркаванні па праблеме крыніц развіцця і прычын заняпаду дакласавага грамадства. Нарэшце, не было аднадумства і ў дачыненні да сацыялагічнай перыядызацыі далёкага мінулага [16, с. 18–19; 9, с. 74, 77–85; 15, с. 90–92; 17, с. 273–274].

Такі імпэт да вызначэння зместу тэрміна «першабытны камунізм» панаваў амаль выключна ў вузкіх навуковых колах Масквы і Ленінграда. Большасць савецкіх спецыялістаў-практыкаў імкнуліся пазбягаць звароту да тэарэтычных пытанняў. Напрыклад, у працах украінскіх даследчыкаў 1930-х гг. разглядаемае паняцце ўвогуле не выкарыстоўвалася [15, с. 92]. Іншая сітуацыя складвалася ў беларускім навуковым асяродку. Ужо ў 1923 г. буйны арганізатар навукі, сацыёлаг і гісторык першабытнай культуры С. З. Кацэнбоген вызначыў першабытны камунізм як «общинный строй первобытной жизни». Навуковец акрэсліў асноўныя характарыстыкі гэтага перыяду гісторыі чалавецтва, а таксама раскрытыкаваў распаўсюджаную практыку «доказывать преимущества грядущего коммунистического общества ссылками на первобытный коммунизм» [18, с. 33–35]. У 1933 г. «першабытна-камуністычны спосаб вытворчасці» згадаў у адным са сваіх артыкулаў акадэмік Беларускай акадэміі навук, бібліеіст і ўсходазнаўца М. М. Нікольскі [19, с. 115].

Менавіта да першабытнага камунізму як найбольш актуальнай на той момант тэорыі дагістарычнага мінулага і звярнуўся В. К. Шчарбакоў. Імкнучыся стварыць ідэалагічна вывераную канцэпцыю гісторыі Беларусі[3], ён вылучыў этап «першабытна-камуністычнага грамадства» і датаваў яго часам ад 25 тыс. гадоў да н. э. да пачатку 2-га тыс. н. э. На думку акадэміка, супольнасцям, якія пражывалі на тэрыторыі нашай краіны на працягу гэтага перыяду, былі ўласцівыя вельмі прымітыўная тэхніка і нізкая прадукцыйнасць працы, адсутнасць прыватнай уласнасці і існаванне калектыўнага карыстання ўсімі сродкамі вытворчасці, першабытна-камуністычны характар вытворчасці і размеркавання (калі прадукцыйныя сілы грамадства былі вельмі слабыя, а сам чалавек амаль цалкам залежаў ад прыроды) [10, с. 19–21]. Акрамя таго, перыяд першабытнага камунізму навуковец падзяліў на шэраг этапаў, такіх як першабытнае «стада»[4] (адзначалася, што ў межах тагачаснай Беларусі гэты этап не быў зафіксаваны), дарадавая камуна, радавая камуна, разлажэнне радавога грамадства [10, с. 24–50].

Згодна з меркаваннем В. К. Шчарбакова, асновай грамадскага ладу самых старажытных супольнасцей на тэрыторыі краіны з'яўлялася дарадавая камуна (першабытная група, «узросна-палавая камуна»). Да ліку асаблівасцей гэтага пачатковага этапу айчыннай гісторыі, які пачаўся каля 25 тыс. гадоў да н. э. і завяршыўся 4–3 тыс. гадоў да н. э., адносілася адсутнасць прыватнай уласнасці і эксплуатацыі чалавека чалавекам, а таксама калектыўны спосаб вытворчасці. Навуковец суаднёс перыяд дарадавой камуны з эпохай палеаліту і сцісла акрэсліў тэрыторыю рассялення, гаспадарчыя заняткі і матэрыяльную культуру першабытнага насельніцтва. Ён адзначыў, што рэдкія і малалікія супольнасці засялялі паўднёвы і паўднёва-ўсходні рэгіёны Беларусі і займаліся арганізаваным паляваннем і збіральніцтвам. На старонках «Нарыса гісторыі Беларусі» былі згаданы найбольш вывучаныя палеалітычныя стаянкі краіны (Бердыж, Юравічы і Клеявічы) і пералічаны выяўленыя на помніках аб'екты, артэфакты і археалагічныя матэрыялы [10, с. 24–29].

Наступны этап развіцця першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі, паводле В. К. Шчарбакова, быў звязаны з зараджэннем і развіццём радавой камуны (радавога грамадства). Гэты перыяд «значнага ўдасканалення тэхнічных прылад і ўскладнення грамадскіх адносін», на думку навукоўца, цягнуўся з 4-га – 3-га тыс. да н. э. да IX–XI стст. н. э. Даследчык сцвярджаў, што асноўнымі рысамі грамадства на працягу больш чым 4 тыс. гадоў з'яўляліся ўзаемадапамога на аснове калектыўнай гаспадаркі, кругавая парука, кроўная помста, культ продкаў, калектыўнае валоданне зямлёй [10, с. 30–31].

На думку В. К. Шчарбакова, пераход ад «узросна-палавой» да радавой камуны адбыўся ў эпоху неаліту. Вызначальнымі рысамі гэтага перыяду былі названы распаўсюджанне новых спосабаў апрацоўкі каменя (пілаванне, свідраванне), выраб глінянага посуду, узнікненне ткацтва, даместыкацыя жывёл (сабакі, козы, авечкі і інш.), пераход да аселага ладу жыцця і вынаходніцтва матыжнага спосабу апрацоўкі зямлі. Акрамя таго, навуковец згадаў «некалькі соцень» неалітычных стаянак, адкрытых на тэрыторыі краіны [10, с. 29–31].

[3] Кажучы пра тэрыторыю Беларусі, В. К. Шчарбакоў, як правіла, меў на ўвазе выключна тэрыторыю БССР. Толькі ў адзінкавых выпадках гісторык згадваў археалагічныя помнікі на тэрыторыі Заходняй Беларусі [10, с. 32, 35].
[4] Менавіта такі русізм быў выкарыстаны ў разглядаемай працы [10, с. 29].

Далейшае развіццё радавога грамадства, паводле В. К. Шчарбакова, было абумоўлена распаўсюджваннем металічных вырабаў. Гісторык адзначаў, што імпартаваныя з Прыбалтыкі і Міжземнамор'я прылады з бронзы («рэшткі бронзавай культуры») былі знойдзены археолагамі ў басейнах усіх асноўных рэк Беларусі. Пры гэтым ён сцвярджаў, што бронзавыя вырабы не адыгрывалі значнай ролі ў сацыяльна-эканамічным жыцці першабытнага насельніцтва [10, с. 32].

Непараўнальна большае значэнне для развіцця старажытнага грамадства, на думку В. К. Шчарбакова, мела ўзнікненне і распаўсюджанне чорнай металургіі і металаапрацоўкі. Аўтар «Нарыса гісторыі Беларусі» даволі падрабязна апісаў працэс атрымання крыц і вырабу прылад з крычнага жалеза. Асаблівую ўвагу ён звярнуў на выпадкі выяўлення беларускімі навукоўцамі плавільных печаў эпохі жалезнага веку [10, с. 32]. Пачатак 1-га тыс. н. э. даследчык назваў часам з'яўлення гарадзішчаў – «умацаваных цэнтраў жыцця родаў» [10, с. 33]. Усяго, паводле даных В. К. Шчарбакова, на тэрыторыі Беларусі было зарэгістравана каля 800 умацаваных паселішчаў, а таксама прыблізна 3000 курганных могільнікаў [10, с. 33].

Пераходзячы да разгляду эпохі рассялення славянскага насельніцтва, навуковец падкрэсліў, што вывучэнне гэтага перыяду абапіраецца галоўным чынам на «пісьмовыя апавяданні». Тым не менш В. К. Шчарбакоў не абмежаваўся выкарыстаннем выключна пісьмовых крыніц. Даследчык датаваў з'яўленне славян на тэрыторыі Беларусі першымі стагоддзямі новай эры і акрэсліў абшар іх пражывання прасторай паміж Нёманам, Бярэзінай і Прыпяццю. Паўночнымі суседзямі славян былі названы літоўскія і фінскія плямёны. Перамяшчэнне славянскіх супольнасцей у межах Беларусі навуковец звязаў з прасоўваннем з поўначы на поўдзень готаў. Завяршэнне славянскай каланізацыі тэрыторыі краіны было аднесена да VII–VIII стст. н. э. [10, с. 34–35].

Істотная ўвага звярталася аўтарам на вызначэнне асаблівасцей грамадскага ладу славянскага насельніцтва. Паводле В. К. Шчарбакова, у IV–X стст. беларускія землі былі падзелены паміж шматлікімі «радавымі аб'яднаннямі» – групамі людзей, звязаных кроўна-роднаснай сувяззю, якія мелі агульную гаспадарку і вялі сваё паходжанне ад агульнага продка. Такія аб'яднанні часам падзяляліся на больш дробныя сацыяльныя адзінкі – кроўна-роднасныя сем'і, якія канцэнтраваліся вакол цэнтраў – гарадзішчаў. Навуковец даводзіў, што паасобныя роды, размешчаныя па суседству, з цягам часу пачыналі ствараць саюзы, на чале якіх станавіліся князі. Нягледзячы на існаванне «племянных правадыроў», усе ключавыя пытанні вырашаліся на агульных сходах – вечах. На думку гісторыка, менавіта такімі рода-племяннымі аб'яднаннямі з моцнымі вечавымі парадкамі і з'яўляліся крывічы, радзімічы і дрыгавічы [10, с. 36–37].

Не засталіся праігнараванымі і пытанні гаспадарчай дзейнасці ўсходнеславянскіх плямёнаў. На старонках «Нарыса гісторыі Беларусі» сцвярджалася, што ў IX–X стст. асноўнай галіной гаспадаркі з'яўлялася земляробства (прычым на неўрадлівых глебах Палесся і Падзвіння яно было маларaспаўсюджаным). Другім па значэнні гаспадарчым напрамкам называлася жывёлагадоўля, у першую чаргу развядзенне дробнай рагатай жывёлы і свіней (конь быў аднесены да «рэдкай хатняй жывёлы»). Падкрэслівалася таксама істотная роля прысвойваючых форм гаспадаркі. Згадваліся і асобныя віды рамесніцкай дзейнасці (вытворчасць прылад працы, глінянага і драўлянага посуду, ткацтва, выраб лодак і інш.) [10, с. 38–39]. Акрамя таго, аўтар разважаў над асаблівасцямі рэлігійных поглядаў старажытнага славянскага насельніцтва, аднак усе яго рэканструкцыі грунтаваліся выключна на фальклорных матэрыялах і даных пісьмовых крыніц [10, с. 39–41].

Апошнюю стадыю першабытнага камунізму – этап разлажэння радавога грамадства – В. К. Шчарбакоў датаваў часам з VII–VIII да IX–XIII стст. Археалагічныя матэрыялы для асвятлення гэтага перыяду навуковец не выкарыстоўваў. Ён меркаваў, што ў канцы 1-га тыс. н. э. ішоў працэс фарміравання класавай вярхушкі, якая прысвойвала дадатковы прадукт і канцэнтравала ў сваіх руках уладу. Даследчык сцвярджаў, што адначасова адбывалася ўзмацненне паасобных сямействаў – прыватных уладальнікаў сродкаў вытворчасці. Наступствамі працэсу паступовага развіцця маёмаснай няроўнасці называлася пераўтварэнне кроўнароднасных аб'яднанняў у суседскія тэрытарыяльныя абшчыны. Вынік разлажэння радавога грамадства В. К. Шчарбакоў прасочваў у стварэнні палітычных аб'яднанняў – старажытных княстваў. На думку даследчыка, кіруючыя вярхі (князі, дружыннікі і купцы), імкнучыся забяспечыць поспех у эксплуатацыі простага насельніцтва, па галоўных гандлёвых шляхах узводзіла ўмацаваныя пункты – гарадзішчы. Характарыстыка фінальнага этапу першабытнага камунізму на тэрыторыі Беларусі завяршалася кароткім аглядам палітычных падзей IX–XI стст. [10, с. 42–50].

У метадалагічным плане праца В. К. Шчарбакова ўяўляла сабой тыповы ўзор публікацыі так званай гістарычнай школы Пакроўскага. Для гэтай школы быў характэрны сацыялагізатарскі схематызм у адлюстраванні гістарычнага мінулага – падыход, які ў сярэдзіне 1930-х гг. быў абвешчаны антынавуковым і антысавецкім (гл., напрыклад, [20; 16, с. 23]). Ужо адразу пасля выхаду ў свет «Нарыс гісторыі Беларусі» крытыкаваўся за празмернае «сацыялагізіраванне» [11, с. 182]. Прыхільнасць В. К. Шчарбакова да погляду М. М. Пакроўскага лягла ў аснову аднаго з пунктаў абвінавачвання даследчыка ў «практычнай контрэвалюцыйнай

дзейнасці»[5]. Згаданыя тэарэтычныя адметнасці працы адзначаліся і ў сучаснай навуковай літаратуры [3, с. 147; 4, с. 8]. Разам з тым дагэтуль не надавалася належнай увагі таму факту, што В. К. Шчарбакоў не толькі выкарыстоўваў метадалагічныя напрацоўкі лідара савецкіх гісторыкаў раннесавецкага часу, але і прыводзіў вытрымкі з яго прац. Так, разглядаючы асаблівасці ледавіковай эпохі, а таксама перыяду славянскай каланізацыі, вучоны тройчы цытаваў М. М. Пакроўскага [10, с. 27, 35, 36]. Ва ўсіх выпадках цытаты былі ўзяты з кнігі «Руская гісторыя ў самым сціслым нарысе»[6] – найбольш папулярнай працы навукоўца, якая на працягу 1920-х – пачатку 1930-х гг. з'яўлялася афіцыйным школьным падручнікам па гісторыі [20, с. 6; 7, с. 192].

Акадэмік Беларускай акадэміі навук працягваў традыцыі папярэдняга дзесяцігоддзя і ў сваіх падыходах да перыядызацыі эпохі першабытнага камунізму на тэрыторыі Беларусі. Гісторыю «дакласавага грамадства» В. К. Шчарбакоў падзяліў на чатыры перыяды, пры гэтым падкрэсліў, што мясцовыя супольнасці прайшлі ў сваім развіцці толькі тры з іх [10, с. 24–50]. Навуковец не ўдакладняў, на якія публікацыі абапіраўся, тым не менш варта меркаваць, што ў аснову сваёй схемы ён паклаў трохчленную сацыялагічную перыядызацыю старажытнага мінулага чалавецтва (дарадавое грамадства, радавое грамадства, разлажэнне радавога грамадства). Гэта канцэпцыя, папулярная ў 1920-х гг., на момант выхаду «Нарыса гісторыі Беларусі» ўжо была абвешчана незадавальняючай (гл., напрыклад, [21, с. 72–75]). Здзейсненая В. К. Шчарбаковым прывязка вылучаных этапаў да класічнай археалагічнай перыядызацыі (датаванне дарадавога грамадства палеалітам, аднясенне часу ўзнікнення радавога ладу да эпохі неаліту) таксама знаходзілася ў рэчышчы тэарэтычных распрацовак 1920-х гг. і ў 1934 г. ужо састарэла [21, с. 73, 78, 82; 22, с. 179–181; 23, с. 16].

Прыведзеная беларускім навукоўцам характарыстыка грамадскіх адносін дарадавога грамадства («узросна-палавой камуны») грунтавалася пераважна на матэрыялах, апублікаваных у зборніку «Першабытнае грамадства», які выйшаў пад рэдакцыяй М. М. Маторына [24, с. 17, 82–84]. Акрамя таго, В. К. Шчарбакоў актыўна звяртаўся да падручніка П. І. Кушнера (Кнышава) «Нарыс развіцця грамадскіх формаў»[7], які з'яўляўся базавым дапаможнікам па аднайменным курсе ва ўсіх «камвузах» і «савпартшколах» да канца 1920-х гг. [25]. Менавіта ў гэтай працы можна знайсці адзначаныя В. К. Шчарбаковым адметнасці радавой камуны[8], а таксама асаблівасці грамадстваў, якія знаходзіліся на этапе разлажэння першабытна-камуністычнага ладу[9].

В. К. Шчарбакоў не пакінуў па-за ўвагай і спадчыну заснавальнікаў марксізму. Апісваючы рода-племянны быт усходнеславянскага насельніцтва канца 1-га тыс. н. э., навуковец параўноўваў яго з грамадскім ладам індзейскага племені ў Амерыцы, прыводзячы цытату з працы Ф. Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» [10, с. 37–38]. Варта заўважыць, што ў вядомым творы нямецкага грамадскага дзеяча і філосафа ішла гаворка пра паўночнаамерыканскіх індзейцаў іракезаў [26, с. 97–98].

Выклікае цікавасць той факт, што пры разглядзе старажытнай гісторыі Беларусі В. К. Шчарбакоў абмежаваўся выключна, кажучы тагачаснай мовай, «сацыялагічнай атрыбуцыяй» – аднясеннем канкрэтных супольнасцей, якія вывучаюцца па рэчавых помніках, да пэўнай стадыі грамадскага развіцця. На старонках «Нарыса гісторыі Беларусі» засталіся цалкам праігнараванымі пытанні, якія і ў 1920-х гг., і ў першай палове 1930-х гг. уяўляліся базіснымі для належнага марксісцкага разумення першабытнасці: эвалюцыя форм сям'і і шлюбнай арганізацыі (пераход ад эндагаміі да экзагаміі), развіццё форм сацыяльнай арганізацыі (матрыярхату і патрыярхату)[10] [27, с. 104–116; 21, с. 75; 22, с. 159–160].

Фактыалагічную аснову абагульняючага нарыса В. К. Шчарбакова склалі вынікі даследаванняў беларускіх археолагаў 1920-х – пачатку 1930-х гг. Аднак у разглядаемай кнізе адсутнічаюць як прозвішчы навукоўцаў, так і спасылкі на іх публікацыі. Аўтар прывёў канкрэтныя звесткі пра гісторыю вывучэння археалагічных аб'ектаў толькі аднойчы – пры апісанні працэсу атрымання жалеза сырадутным спосабам [10, с. 32]. Такая ўвага да праблематыкі чорнай металургіі можа быць патлумачана тым, што ў 1933 г. В. К. Шчарбакоў выступаў навуковым рэдактарам даследавання А. М. Ляўданскага, прысвечанага гісторыі жалезнага промыслу [28].

Асобныя палажэнні «Нарыса гісторыі Беларусі», напрыклад тэзісы аб абмежаваным выкарыстанні каня ў сельскай гаспадарцы, відавочна, былі ўзяты з публікацыі Б. А. Рыбакова «Радзімічы» [29, с. 107]. Гэтаназіранне заслугоўвае асаблівай увагі ў сувязі з тым, што ў другой сваёй манаграфіі 1934 г. В. К. Шчарбакоў назваў працу Б. А. Рыбакова «работай, якая цал-

[5] З пратакола допыту першага дэкана гістфака БДУ Шчарбакова Васіля Карпавіча // История создания и становления университета [Электронный ресурс]. URL: https://time.bsu.by/ru/bsu-hist/bsu-history/1921–1941/ispytaniya-1930–1941/arkhivnye-dokumenty/552–3-pratakola-dopytu-pershaga-dekana-gistfaka-bdu-shchchar bakova-vasilya-karpavicha.html (дата звароту: 12.04.2020).

[6] *Покровский М. Н.* Русская история в самом сжатом очерке : учебник. 4-е изд. М. : Партиздат, 1933. С. 17–19.

[7] *Кушнер (Кнышев) И.* Очерк развития общественных форм : учеб. пособие для комвузов, вузов и совпартшкол. 7-е изд., стер. М. : Изд-во Ком. ун-та им. Я. М. Свердлова, 1929. 630 с.

[8] Там же. С. 136–138, 157–163.

[9] Там же. С. 213–242.

[10] Там же. С. 145–157, 163–174.

кам прасякнутая буржуазнымі метадалагічнымі ўстаноўкамі, якая і сваім матэрыялам, і сваімі абагульненнямі падмацоўвае палажэнні нацдэмаўскай схемы гістарычнага развіцця Беларусі» [30, с. 104].

Не з'яўляючыся спецыялістам у галіне археалогіі, аўтар «Нарыса гісторыі Беларусі» даволі вольна абыходзіўся з даступнымі яму данымі. Напрыклад, даючы пералік катэгорый археалагічных артэфактаў, выяўленых на верхнепалеалітычных стаянках краіны, ён згадаў шматлікія касцяныя прылады працы [10, с. 26], нягледзячы на тое, што яны на беларускіх помніках не былі знойдзены [31, с. 218–219]. Эпоху бронзавага веку навуковец атаясамліваў з «бронзавай культурай» [10, с. 32] – таксонам, які прафесійнымі археолагамі не выкарыстоўваўся.

Тэкст раздзела, прысвечанага першабытна-камуністычнаму грамадству, дапаўняўся ілюстрацыямі. Апублікаваўшы выявы археалагічных помнікаў і артэфактаў В. К. Шчарбакоў, не прывёў спасылак на выкарыстаную літаратуру. Тым не менш можна вызначыць, што асноўнай крыніцай ілюстраваных матэрыялаў з'яўляліся тры тамы прац археалагічнай камісіі (секцыі археалогіі Беларускай акадэміі навук). Малюнкі былі ўзяты з артыкулаў С. М. Замятніна [32, табл. 1, *4*, *6*, *7*; табл. 2, *18*], К. М. Палікарповіча [33, табл. 2, *19*, табл. 8, *7*, табл. 11, *7*, *9*, табл. 17, *9*, *19*], А. М. Ляўданскага [34, мал. 12; 35, мал. 10] і інш. Таксама ў якасці ілюстрацыі была выкарыстана рэпрадукцыя вядомага роспісу залы Гістарычнага музея ў Маскве аўтарства В. М. Васняцова «Каменны век. Паляванне на маманта» [10, с. 26].

## Заключэнне

«Нарыс гісторыі Беларусі» В. К. Шчарбакова стаў першай у айчыннай гістарыяграфіі спробай сістэматычнага асвятлення пачаткаў гісторыі нашай краіны ў марксісцкім ключы. Навуковец, на практыцы рэалізуючы фармацыйны падыход да разгляду мінулага, вылучыў перыяд першабытна-камуністычнага грамадства і датаваў яго часам ад 25 тыс. гадоў да н. э. да пачатку 2-га тыс. н. э. У межах гэтай працяглай эпохі, у адпаведнасці з сацыялагічным разуменнем перыядызацыі, былі акрэслены і падрабязна разгледжаны тры этапы развіцця дакласавага грамадства. Для кожнага са згаданых этапаў В. К. Шчарбакоў прапанаваў гістарычныя рэканструкцыі, якія ўлічвалі дасягненні першабытнай і раннесярэдневяковай археалогіі Беларусі. Разам з тым аўтар не ставіў перад сабой мэты падрыхтоўкі паўнавартаснай археалагічнай публікацыі. Ствараючы сінтэтычны агляд гісторыі Беларусі, ён уключыў у яго толькі некаторыя тэмы, датычныя археалогіі, пры гэтым дапусціў шэраг фактычных памылак і недакладнасцей. Метадалагічныя падыходы В. К. Шчарбакова да вывучэння старажытнасці знаходзіліся ў рэчышчы тэарэтычных распрацовак савецкай гістарычнай навукі 1920-х – пачатку 1930-х гг. і на момант выхаду кнігі ўжо страцілі сваю актуальнасць.

З аднага боку, у сярэдзіне – другой палове 1930-х гг. тэорыя першабытнага камунізму неаднаразова выкарыстоўвалася беларускімі даследчыкамі. Так, ва ўжо адзначанай праграме па ўніверсітэцкім курсе «Гісторыя дакласавага грамадства» А. М. Ляўданскі суаднёс асноўныя археалагічныя эпохі з пэўнымі стадыямі «першабытна-камуністычнай (архаічнай) фармацыі» [1, с. 17–18]. Асобныя палажэнні канцэпцыі паўтараліся ў артыкуле, прысвечаным праблемам старажытнай гісторыі Беларусі, які быў апублікаваны ў 1938 г. групай супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук пад рэдакцыяй М. М. Нікольскага [36, с. 167, 169, 173–174]. З іншага боку, публікацыі канца 1930-х гг. нельга разглядаць у кантэксце далейшага развіцця напрацовак беларускага марксісцкага гісторыка. «Нарыс гісторыі Беларусі», напісаны у сціслыя тэрміны, амаль так жа хутка ўслед за сваім аўтарам на доўгія дзесяцігоддзі трапіў у нябыт.

Разгляд дагістарычнага мінулага, здзейснены В. К. Шчарбаковым, варта ўспрымаць як адметны феномен сваёй эпохі. Яго вывучэнне з'яўляецца істотным чыннікам лепшага разумення гісторыі беларускай археалагічнай і гістарычнай думкі міжваеннага часу.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Зуева АУ, Курловіч-Бяляўская ПС. А. М. Ляўданскі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У: Ляўко ВМ, рэдактар. *Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Выпуск 26. Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых помнікаў на тэрыторыі Беларусі (да 120-годдзя з дня нараджэння А. М Ляўданскага)*. Мінск: Беларуская навука; 2015. с. 15–19.
2. Прохоров АА, Яновский ОА, Назаренко АМ, составители. *Исторический факультет БГУ. 80 лет.* Минск: БГУ; 2014. 155 с.
3. Лінднэр Р. *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст.* 2-е выданне. Санкт-Пецярбург: Неўскі прасцяг; 2005. 540 с.
4. Белозорович ВА. Концепция истории Беларуси в трудах В. К. Щербакова. В: Король АД, редактор. *История и историография: объективная реальность и научная интерпретация*. Минск: БГУ; 2018. с. 5–9.
5. Карев ДВ. *Белорусская историография и формирование исторического сознания белорусов в 1914–1945 гг. (основные тенденции развития в геополитическом контексте эпохи)*. Гродно: ЮрСаПринт; 2016. 112 с.

6. Яновский ОА. Василий Карпович Щербаков. Организатор исторического образования в Беларуси. В: Абламейко СВ, редактор. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941 гг.).* Минск: БГУ; 2017. с. 197–209.
7. Генинг ВФ. *Очерки по истории советской археологии*. Киев: Наукова думка; 1982. 227 с.
8. Формозов АА. *Русские археологи в период тоталитаризма: Историографические очерки*. Москва: Знак; 2006. 344 с.
9. Алымов СС. *П. И. Кушнер и развитие советской этнографии в 1920–1950-е гг.* Москва: ИЭА; 2006. 278 с.
10. Шчарбакоў ВК. *Нарыс гісторыі Беларусі. Частка 1*. Мінск: Выдавецтва Беларускай акадэміі навук; 1934. 240 с.
11. Хроніка. Над чым працавалі інстытуты БелАН у 1934 г. *Запіскі Беларускай акадэміі навук*. 1935;4:181–186.
12. Тер-Акопян НБ. К истории термина и понятия «первобытный коммунизм». В: Чиколини ЛС, редактор. *История социалистических учений: сб.статей*. Москва: Издательство АН СССР; 1986. с. 3–25.
13. Бромлей ЮВ, редактор. *История первобытного общества. Том 1. Общие вопросы. Проблемы антропосоциогенеза*. Москва: Наука; 1983. 432 с.
14. Семенов ЮИ. О первобытном коммунизме, марксизме и сущности человека. *Этнографическое обозрение*. 1992;3:31–46.
15. Цеунов И. Поняття «первісний комунізм» у радянській археології 20–30-х рр. XX ст. В: Гурьянов ВН, Мищенко ТА, Чубур АА, Шинаков ЕА, Щеглова ОА, редакторы. *Древности Средне-Западной России и сопредельных территорий. Материалы XXXII международной студенческой археолого-этнологической конференции; 21–23 мая 2016 г.; Брянск, Россия*. Брянск: РИО БГУ; 2016: 86–94.
16. Клейн ЛС. *Феномен советской археологии*. Санкт-Петербург: Фарн; 1993. 128 с.
17. Метель ОВ. О пользе истории докапиталистических формаций для социалистического строительства: дискуссия о первобытном коммунизме в советской историографии. *Вестник Омского университета. Серия: Исторические науки*. 2018;1:272–282.
18. Каценбоген СЗ. *Первобытный человек. Опыт социологического анализа этнографического романа Рене Марана «Батуала»*. Минск: Белтрестпечать; 1923. 50 с.
19. Никольский НМ. Как я работал над стабильным учебником древней истории. *Народный учитель*. 1933;4:114–116.
20. Панкратова А. Развитие исторических взглядов М. Н. Покровского. В: Греков Б, Бушуев С, Лебедев В, редакторы. *Против исторической концепции М. Н. Покровского. Часть 1*. Москва: Академия наук СССР; 1939. с. 5–69.
21. Равдоникас ВИ. О периодизации истории доклассового общества. *Проблемы истории докапиталистических обществ*. 1934;7–8:72–87.
22. Равдоникас ВИ. Маркс – Энгельс и основные проблемы доклассового общества. В: Марр Н, Пригожин А, редакторы. *Карл Маркс и проблемы истории докапиталистических формаций. Сборник к 50-летию со дня смерти Карла Маркса.* Москва: Огиз, 1934. с. 118–216. (Известия Государственной академии истории материальной культуры; выпуск 90).
23. Першиц АИ, Итина МА. С. П. Толстов – этнограф, археолог, востоковед. *Этнографическое обозрение*. 1997;1:14–23.
24. Маторин НМ, редактор. *Первобытное общество*. Москва: Журнально-газетное объединение; 1932. 256 с.
25. Гуковский А. П. И. Кушнер. Очерк развития общественных форм. *Историк-марксист*. 1927;4:233–235.
26. Энгельс Ф. Происхождение семьи, частной собственности и государства. В: Маркс К, Энгельс Ф. *Собрание сочинений. Том 21.* 2-е издание. Москва: Госполитиздат; 1961. с. 28–178.
27. Ефименко ПП. Маркс и проблемы древнейшего периода первобытнокоммунистического общества. В: Марр Н, Пригожин А, редакторы. *Карл Маркс и проблемы истории докапиталистических формаций. Сборник к 50-летию со дня смерти Карла Маркса*. Москва: Огиз; 1934. с. 91–117. (Известия Государственной академии истории материальной культуры. Выпуск 90).
28. Ляўдансі АН. Да гісторыі жалезнага промыслу на Палесьсі: Рудні і месцазнаходжаньні руды. У: Шчарбакоў ВК, рэдактар. *Працы палескай экспедыцыі. Выпуск 2*. Мінск: [б. в.]; 1933. 40 с.
29. Рыбакоў БА. Радзімічы. *Працы секцыі археалогіі Беларускай акадэміі навук*. 1932;3:81–151.
30. Шчарбакоў ВК. *Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі*. Мінск: Выдавецтва Беларускай акадэміі навук; 1934. 105 с.
31. Палікарповіч КМ. Палеоліт і мэзоліт БССР і некаторых суседніх краін Верхняга Падняпроўя. *Працы секцыі археалогіі Беларускай акадэміі навук*. 1932;3:218–221.
32. Замятнін СМ. Раскопкі Бердыскай палеолітычнай стаянкі ў 1927 г. *Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы Археолёгічнай камісіі*. 1930;2(11):479–490.
33. Палікарповіч КМ. Дагістарычныя стаянкі сярэдняга Сажа. Матар'ялы абследаванняў 1927 г. *Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы Археалагічнай камісіі*. 1930;2(11):383–478.
34. Ляўдансі АН. Археолёгічныя раскопкі ў м. Заслаўі Менскай акругі. *Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы кафедры археалогіі.* 1928;1(5):1–92.
35. Ляўдансі АН. Курганны магільнік каля в. Чаркасова Аршанскае акругі. *Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы Археолёгічнай камісіі*. 1930;2(11):57–70.
36. Никольский НМ. Проблемы древней истории Белоруссии. *Вестник древней истории*. 1938;1:164–175.

## References

1. Zuyeva AU, Kurlovich-Bialiauskaya PS. A. M. Liaudanski and the Belarusian State University. In: Liauko VM, editor. *Materials on the archaeology of Belarus. Volume 26. The results of investigations of the prehistoric and medieval archeological sites on the territory of Belarus (to the 120th anniversary of the birth of A. M. Levdansky)*. Minsk: Belaruskaja navuka; 2015. p. 15–19. Belarusian.
2. Prokhorov AA, Yanovsky OA, Nazarenko AM, compilers. *The BSU faculty of history. 80th anniversary*. Minsk: Belarusian State University; 2014. 155 p. Russian and English.

3. Lindnjer R. *Gistoryki i wlada: nacyjatvorchy pracjes i gistarychnaja palityka w Belarusi XIX–XX stst.* [Historians and authorities: the nation-making process and historical politics in Belarus in the 19th and 20th centuries]. 2nd edition. Saint Petersburg: Newski prascjag; 2005. 540 p. Belarusian.

4. Belozorovich VA. [The concept of the history of Belarus in the works of V. K. Shcherbakov]. In: Korol AD, editor. *Istoriya i istoriografiya: ob'ektivnaya real'nost' i nauchnaya interpretatsiya* [The history and historiography: objective reality and scientific interpretation]. Minsk: Belarusian State University; 2018. p. 5–9. Russian.

5. Karev DV. *Belorusskaya istoriografiya i formirovanie istoricheskogo soznaniya belorusov v 1914–1945 gg. (osnovnye tendentsii razvitiya v geopoliticheskom kontekste epokhi)* [Belarusian historiography and the formation of the historical consciousness of Belarusians in 1914–1945 (main development trends in the geopolitical context of the era)]. Hrodna: YurSaPrint; 2016. 112 p. Russian.

6. Yanovskii OA. [Vasilii Karpovich Shcherbakov. The organizer of the historical education in Belarus]. In: Ablameiko SV, editor. *Intellektualnaya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazovaniya* [Intellectual elite of Belarus. The founders of Belarusian science and higher education (1919–1941)]. Minsk: Belarusian State University; 2017. p. 197–209. Russian.

7. Gening VF. *Ocherki po istorii sovetskoi arheokogii* [Essays on the history of Soviet archaeology]. Kyiv: Naukova dumka; 1982. 227 p. Russian.

8. Formozov AA. *Russkie arkheologi v period totalitarizma: istoriograficheskie ocherki* [Russian archaeologists in the period of totalitarianism: historiographical essays]. Moscow: Znak; 2006. 344 p. Russian.

9. Alymov SS. *P. I. Kushner i razvitie sovetskoi etnografii v 1920–1950-e gg.* [P. I. Kushner and the development of Soviet ethnography in the 1920–50s]. Moscow: IEA; 2006. 278 p. Russian.

10. Shcharbakou VK. *Narys gistoryi Belarusi. Chastka 1* [The essay on the history of Belarus. Part 1]. Minsk: Publishing House of the Belarusian Academy of Sciences; 1934. 240 p. Belarusian.

11. [The Chronicle. What the institutes of Belarusian Academy of Sciences worked on in 1934]. *Zapiski Belaruskaj akademii navuk*. 1935;4:181–186. Belarusian.

12. Ter-Akopjan NB. [To the history of the term and concept of «primitive communism»]. In: Chikolini LS, editor. *Istoria sotsialisticheskikh uchenii* [The history of socialist doctrines]. Moscow: Publishing House of the Academy of Sciences of USSR; 1986. p. 3–25. Russian.

13. Bromlei YuV, editor. *Istoriya pervobytnogo obshchestva. Tom 1. Obshchie voprosy. Problemy antroposotsiogeneza* [The history of primitive society. Volume 1. General issues. Problems of anthroposociogenesis]. Moscow: Nauka; 1983. 432 p. Russian.

14. Semenov YuI. [About primitive communism, Marxism and the essence of man]. *Etnograficheskoe obozrenie*. 1992;3:31–46. Russian.

15. Tseunov I. [The concept of «primitive communism» in Soviet archaeology of the 20–30s of the 20th century]. In: Gur'yanov VN, Mishchenko TA, Chubur AA, Shinakov EA, Shcheglova OA, editors. *Drevnosti Sredne-Zapadnoi Rossii i sopredel'nykh territorii. Materialy XXXII mezhdunarodnoi studencheskoi arkheologo-etnologicheskoi konferentsii; 21–23 maya 2016 g.; Bryansk, Rossiya* [Antiquities of the Middle-Western Russia and adjacent territories. Proceedings of the International student archeological and ethnological conference; 2016 May 21–23]. Bryansk: Editorial and publishing department, Bryansk State University; 2016: 86–94. Ukrainian.

16. Klein LS. *Fenomen Sovietskoi arkheologii* [The phenomenon of Soviet archaeology]. Saint Petersburg: Farn; 1993. 128 p. Russian.

17. Metel OV. The benefits of the history of pre-capitalist formations to the socialist construction: the discussion on the primitive communism in the Soviet historiography. *Vestnik Omskogo universiteta. Seriya: Istoricheskie nauki*. 2018;1:272–282. Russian.

18. Katsenbogen SZ. *Pervobutnyi chelovek. Opyt sotsiologicheskogo analiza etnograficheskogo romana Rene Marana «Batuala»* [Primitive man. The experience of sociological analysis of the ethnographic novel of Rene Maran «Batuala»]. Minsk: Beltrestpechat'; 1923. 50 p. Russian.

19. Nikolskij NM. [How I worked on a stable textbook of ancient history]. *Narodnyi uchitel'*. 1933;4:114–116. Russian.

20. Pankratova A. [The development of historical views of M. N. Pokrovsky]. In: Grekov B, Bushuyev S, Lebedev V, editors. *Protiv istoricheskoi kontseptsii M. N. Pokrovskogo. Chast' 1* [Against the historical concept of M. N. Pokrovsky. Part 1]. Moscow: Academy of Sciences of USSR; 1939. p. 5–69. Russian.

21. Ravdonikas VI. [About the periodization of the history of pre-class society]. *Problemy istorii dokapitalisticheskikh obshchestv*. 1934;7–8:72–87. Russian.

22. Ravdonikas VI. [Marx – Engels and the main problems of pre-class society]. In: Marr N, Prigozshin A, editors. *Karl Marks i problemy istorii dokapitalisticheskikh formatsii. Sbornik k 50-letiyu so dnya smerti Karla Marksa* [Karl Marx and the problems of the history of pre-capitalist formations: a collection for the 50th anniversary of the death of Karl Marx]. Moscow: Ogiz; 1934. p. 118–216. (State Academy of History of Material Culture news; volume 90). Russian.

23. Pershits AI, Itina MA. [S. P. Tolstov is ethnographer, archaeologist, orientalist]. *Etnograficheskoe obozrenie*. 1997;1:14–23. Russian.

24. Matorin NM, editor. *Pervobytnoye obshchestvo* [Primitive society]. Moscow: Zhurnal'no-gazetnoe ob'edinenie; 1932. 256 p. Russian.

25. Gukovskii A. [P. I. Kushner. Essay on the development of social forms]. *Istorik-marksist*. 1927;4:233–235. Russian.

26. Engels F. [The origin of the family, private property, and the state]. In: Marx K, Engels F. *Sobranie sochinenii. Tom 21* [Collection of the works. Volume 21]. 2nd edition. Moscow: Gospolitizdat; 1961. p 28–178. Russian.

27. Efimenko PP. [Marx and the problems of the most ancient period of the primitive communist society]. In: Marr N, Prigozshin A, editors. *Karl Marks i problemy istorii dokapitalisticheskikh formatsii. Sbornik k 50-letiyu so dnya smerti Karla Marksa* [Karl Marx and the problems of the history of pre-capitalist formations: a collection for the 50th anniversary of the death of Karl Marx]. Moscow: Ogiz; 1934. p. 91–117. (State Academy of History of Material Culture news; volume 90). Russian.

28. Ljaudanski AN. [To the history of the iron industry in Polesie: «Rudnya» and ore locations]. In: Shcharbakou VK, editor. *Pracy paleskaj ekspedycyi. Vypusk 2* [Works of the Polesie expedition. Volume 2]. Minsk: [s. n.]; 1933. 40 p. Belarusian.
29. Rybakou BA. [Radimichi]. *Pracy sekcyi arhealogii Belaruskaj Akadjemii navuk*. 1932;3:81–151. Belarusian.
30. Shcharbakou VK. *Klasavaja barac'ba i gistarychnaja navuka na Belarusi* [Class struggle and historical science in Belarus]. Minsk: Publishing House of the Belarusian Academy of Sciences; 1934. 105 p. Belarusian.
31. Palikarpovich KM. [Paleolithic and Mesolithic of the BSSR and some adjacent countries of the Upper Dniepier]. *Pracy sekcyi arhealogii Belaruskaj Akadjemii navuk*. 1932;3:218–221. Belarusian.
32. Zamjatnin SM. [Excavations of the Berdyzh Paleolithic site in 1927]. *Zapiski addzela gumanitarnyh navuk. Pracy Arhealagichnaj kamisii*. 1930;2(11):479–490. Belarusian.
33. Palikarpovich KM. [Prehistoric sites of the Middle Sozh River. Materials of Survey in 1927]. *Zapiski addzela gumanitarnyh navuk. Pracy Arhealagichnaj kamisii*. 1930;2(11):383–478. Belarusian.
34. Ljaudanski AN. [Archaeological excavations in Zaslavl' of Minsk district]. *Zapiski addzela gumanitarnyh navuk. Pracy kafedry arhealogii*. 1928;1(5):1–92. Belarusian.
35. Ljaudanski AN. [Burial mound cemetery near the village Charkasova in Orsha District]. *Zapiski addzela gumanitarnyh navuk. Pracy Arheoljogichnaj kamisii*. 1930;2(11):57–70. Belarusian.
36. Nikolskij NM. [Problems of the ancient history of Belorussia]. *Vestnik drevnei istorii*. 1938;1:164–175. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 07.05.2020.*
*Received by editorial board 07.05.2020.*